**Андрэй Замойскі**
(Гомель)

# Стасункі паміж жыхарамі мястэчак Беларусі і савецкай уладай у 1918-1928 гг.

У пасляваеннай савецкай беларускай гістарыяграфіі адлюстраванню гістарычнага мінулага мястэчак у 1920-я гады як спецыфічных полікультурных паселішчаў пашанцавала значна меней, чым гісторыі гарадоў, фабрык і г.д. Мястэчкі не цікавілі афіцыйную гістарыяграфію па розных прычынах, паколькі традыцыйная гаспадарка мястэчак не была паказчыкам сацыялістычных поспехаў у эканоміцы БССР, а яўрэйскасць многіх мястэчак ніякім чынам не пасавала для даследаванняў падчас табу на яўрэйскія тэмы. Багатыя архіўныя матэрыялы партыйных і савецкіх архіваў, цікавыя і каштоўныя артыкулы беларускіх краязнаўцаў па розных мястэчках, назапашаныя ў 1920-я гг., чакалі сваіх даследчыкаў. Толькі з 1990-х гадоў па зразумелых прычынах пашырылася цікавасць да жыцця мястэчак як у дарэвалюцыйны, так і паслярэвалюцыйныя часы. Гісторыя мястэчак прываблівае ўвагу айчынных і замежных даследчыкаў, якія займаюцца вывучэннем працэсаў урбанізацыі, культуры і гаспадаркі паселішчаў Беларусі[1]. Пэўную цікавасць прадстаўляе пытанне, як складваліся стасункі ўлады і жыхароў мястэчак ад часоў ваеннага камунізму да згортвання нэпа.

[1] І. Соркіна, *Праблемы яўрэйскіх мястэчак Беларусі на старонках часопіса «Наш край» (другая палова 1920-х гадоў)*, „Гістарычны Альманах”, 2004, вып. 10, [у:] http://kamunikat.fontel.net/www/czasopisy/almanach/10/12.htm; L. Smilovicki, *A Belorussian Border Shtetl in the 1920s and 1939s: The Case of Turov*, „Jews in Russian and Eastern Europe”, Jerusalem, Summer 2003, no. 1 (50), pp. 109-137; A. Zeltser, *The Shtetl During the „Great Watershed” of 1929-1931: The Case of Vitebsk Region*, „Jews in Eastern Europe”, Jerusalem, Winter 2001, no. 3 (46), pp. 5-34; A. Zeltser, V. Selemenev, *Kolyshki — A Shtetl in the Late 1930s*, „Jews in Eastern Europe”, Jerusalem, Fall 2001, no. 2 (45), pp. 48-73; E. Shkolnikova, *The Transformation of the Shtetl in the USSR in the 1930s.*, „Jews in Russia and Eastern Europe”, Jerusalem, Summer 2004, no. 1 (52), pp. 91-129; А. Зельцер, *Еврей советской провинции: Витебск и местечки (1917-1941)*, Москва 2006.

Няма дакладных крытэрыяў чым мястэчка адрозніваецца ад малага горада ці ад буйнога сяла. Мястэчкі маглі быць розныя па сваіх памерах і колькасці насельніцтва — ад некалькіх соцень да некалькіх тысяч жыхароў. Асноўнымі вызначальнымі крытэрыямі мястэчка маглі быць колькасць насельніцтва не меней чым паўтысячы сталых жыхароў і „гарадскія" заняткі (рамесніцтва, гандаль) больш чым паловы эканамічна актыўнага насельніцтва[2].

Мястэчкі Савецкай Беларусі яшчэ ў 1920-я гады перажылі тое, з чым яшчэ павінны былі сутыкнуцца такія ж паселішчы з польскага боку мяжы ў 1939-1941 гг. Розныя працэсы паспрыялі знікненню мястэчак як своеасаблівых паселішчаў. Былі гэта працэсы сацыяльнай нівеліроўкі, развіцця сацыялістычнай эканомікі на падставе фарсіраванай індустрыялізацыі і калектывізацыі, нацыянальнай палітыкі, накіраванай на зліццё этнасаў у савецкі народ.

Агульна прызнана, што мястэчка канчаткова знікла ў полымі Галакосту, калі на працягу некалькіх гадоў былі вынішчаны (у некаторых мястэчках нават цалкам) яўрэйскія супольнасці. Страціўшы сваіх яўрэйскіх жыхароў, мястэчкі пазбавіліся асноўнага падмурковага элемента — т.зв. штэтла (ідыш — мястэчка, маленькі горад). Пад штэтлам можна разумець як і яўрэйскі квартал (вулачкі, цэнтральную частку паселішча, дзе гістарычна мясціліся яўрэі), так і усё мястэчка, калі ў ім колькасна дамінавалі яўрэі. Штэтл уяўляў сабой спецыфічную форму грамадскага і культурнага жыцця[3]. Не толькі яўрэйская супольнасць адыгрывала пэўную ролю ў жыцці мястэчка. Беларусы, палякі, рускія і татары стваралі пэўныя супольнасці, якія ад даўна мясціліся ў мястэчках.

У гады нэпа, прызнаючы пэўную гаспадарчую ролю мястэчак, бальшавікі перагледзелі колькасны і якасны склад такіх паселішчаў. СНК БССР пастановай ад 8 кастрычніка 1924 года вылучаў 3 катэгорыі паселішчаў а) гарады, б) мястэчкі, в) вёскі[4]. Падчас адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформы частка мястэчак атрымала гарадскі статус, да

[2] З. В. Шыбека, *Гарады Беларусі (60-я гады XIX — пачатак XX стагоддзяў)*, Мінск 1997, с. 80.

[3] Больш падрабязна аб феномене штэтл на Беларусі і Польшчы ў зборніках артыкулаў, манаграфіях, энцыклапедыях: R. Renz, *Życie codzienne w miasteczkach województwa kieleckiego 1918-1939*, Kielce 1994; *Sztetł — wspólne dziedzictwo: szkice z dziejów ludności żydowskiej Europy Środkowo-Wschodniej*, red. A. Markowski i W. Śleszyński, Białystok 2003; *The Shtetl: Myth and Reality*, Polin. Studies in Polish Jewry, vol. 17, ed. by Antony Polonsky, Oxford 2004; *Żydzi w Polsce. Dzieje i kultura.* Leksykon, red. J. Tomaszewski, A. Żbikowski, Warszawa 2001.

[4] Постановление СНК БССР от 8 октября 1924 года о типах населенных пунктов БССР, Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей: НАРБ), ф. 4, воп. 3, спр. 4, арк. 167.

якога яны ўжо дайшлі ў дарэвалюцыйныя часы, але царская адміністрацыя не спяшалася надаваць гарадскі статус беларускім мястэчкам[5]. СНК БССР 3 ліпеня 1925 года выдаў пастанову «Об утверждении списка городов и местечек БССР», згодна якому вылучалася 26 гарадоў і 49 мястэчак[6]. Мястэчкі сельскага тыпу пераводзіліся ў катэгорыю вёсак. Скарачэнне колькасці мястэчак было найбольш выразнае на Магілёўшчыне, Аршанчшчыне, Віцебшчыне (табліца 1). Статус мястэчак

**Табліца 1. Змяншэнне колькасці мястэчак па акругах па пастанове СНК БССР ад 1925 г.**

| акруга | да пастановы | пасля | засталося (%) |
|---|---|---|---|
| Мінская | 19 | 8 | 42,1 |
| Віцебская | 15 | 5 | 33,33 |
| Аршанская | 20 | 5 | 25,0 |
| Мазырская | 11 | 4 | 36,36 |
| Бабруйская | 13 | 4 | 30,76 |
| Магілёўская | 15 | 3 | 20,0 |
| Полацкая | 15 | 4 | 26,66 |
| Слуцкая | 15 | 5 | 33,33 |
| Барысаўская | 12 | 7 | 58,33 |
| Калінінская | 15 | 4 | 26,66 |
| Усяго | 150 | 49 | 32,66 |

Падлічана па: Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4, оп. 10, д. 104, л. 191.

захаваўся за паселішчамі гарадскога тыпу, цэнтрамі раёнаў ці буйнымі паселішчамі. З далучэннем Гомельшчыны колькасць мястэчак узрасла да 56, якой і заставалася да канца нэпа. Мястэчкі, стаўшыя вёскамі, развіваліся як сельскія паселішчы, не атрымлівалі значных інвестыцый у мясцовую прамысловасць, а мяжа, якая адрознівала іх ад звычайных вёсак, паступова знікала. Найбольш у гаспадарчым і культурным плане шанцавала мястэчку раённаму цэнтру, дзе паўставалі новыя прадпрыемствы, культурна-асветніцкія ўстановы, і ў той жа час працэсы саветызацыі адбываліся хутчэй, чым у іншых. У кожным раёне

[5] З. Шыбека, *Гарады Беларусі...*, с. 40.

[6] Собрание законов и распоряжений правительсва БССР (далей: СЗ БССР), 1925, № 3, с. 234.

было 2-3 буйных мястэчкі, а паміж некаторымі ішла канкурэнтная барацьба, каб стаць райцэнтрам (напрыклад, Бобр і Крупкі)[7]. Трэба адзначыць, што яўрэйская супольнасць была вельмі ўплывовай у мястэчках, як у колькасным плане (табліца 2), так і ў гаспадарчай і культур-

**Табліца 2. Адсотак яўрэйскага насельніцтва ў 54 мястэчках БССР (1926 г.)**

| Адсотак | Колькасць мястэчак | % |
|---|---|---|
| 0-25% | 5 | 8,9 |
| 25-40 | 13 | 23,3 |
| 40-50 | 16 | 28,6 |
| 50-60 | 14 | 25 |
| 60-70 | 5 | 8,9 |
| 70-80 | 2 | 3,6 |
| 80- | 1 | 1,7 |
| Усяго | 56 | 100 |

Падлічна па: Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, ф. 4, воп. 21, спр. 212, арк. 229.

най сферах. Многія захады цэнтральнай улады БССР тычыліся мястэчак, менавіта ўлічваючы яўрэйскі фактар.

1917 год прынёс істотныя палітычныя змены ў жыццё былой Расійскай імперыі. Устанаўленне ўлады бальшавікоў на Беларусі было такім жа жорсткім як у іншых рэгёнах былой Расійскай імперыі, але сітуацыя значна ўскладнялася наступствамі вялікай вайны, наяўнасцю войска былой Расійскай імперыі. Зразумела, што бальшавікі мелі падтрымку з боку часткі насельніцтва мястэчак і наваколляў, але ў большасці местачкоўцы выказвалі сімпатыі яўрэйскім нацыянальным палітычным рухам (бундызму, сіянізму). Сярод земляробаў, таксама як і рабочых мясцовых прадпрыемстваў папулярнасцю карысталіся эсэры. Местачкоўцы і сяляне разганялі старыя ўстановы ўлады, так у Шчадрыне мясцовая жыхары выгналі ўрадніка Царыка, вядомага сваім хабарніцтвам, а ў Тураве раз'юшаны натоўп граміў выявы і помнікі каранаваным асобам[8]. Паўсюль ствараліся новыя выбарныя органы ўлады —

[7] В. А. Круталевіч, І. А. Юхо, *Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (1917-1945 гг.)*, Мінск 2000, с. 156-157.

[8] М. Ляховіцкій, *Сто лет существования еврейского местечка Щедрін*, „Роднік”, № 25, апрель 1993 г., с. 9.

саветы. Падчас ваенных дзеянняў ці вызвалення пэўнай тэрыторыі ствараліся рэўкамы, да якіх належала поўная ўлада ў мястэчках.

Нямецкая, а пазней польская акупацыя Беларусі замарудзілі палітычныя і гаспадарчыя змены, меўшыя месца на тэрыторях кантраляваных саветамі. Жыхары мястэчак, сімпатызуючыя бальшавікам і савецкай уладзе, праследавілася акупацыйнай адміністрацыяй. Польскія легіянеры, па пазнейшых сведчаннях жыхароў, чынілі рабункі і гвалты над насельніцтвам, асабліва здекваючыся над сялянамі і яўрэямі[9]. Пры актыўнай дапамозе з боку Масквы пашыралася дзейнасць „чырвоных партызан", у злучэннях якіх налічвалася нямала моладзі з навакольных вёсак і мястэчак. Побач з м. Карма ў 1919 г. узнікла і т.зв. „Хізаўская рэспубліка". Партызаны, у большасці беларусы з вёсак і мястэчка, рабілі напады на польскіх легіянераў, а пазней уліліся ў Чырвоную Армію. Насельніцтва мястэчак перажыло тэрор з боку розных палітычных сіл. Арышты, расстрэлы, збіццё шырока выкарыстоўваліся як бальшавікамі, так іх ваеннымі і палітычнымі праціўнікамі. Значную ролю ў ламанні правоў жыхароў адыгралі часовыя ўстановы ўлады — камбеды, рэўкамы і інш.

Супраць сваёй волі насельніцтва мястэчак стала закладнікам палітычнай сітуацыі, склаўшайся на беларускіх землях. У некаторых паселішчах адбыліся антыбальшавіцкія паўстанні. Паўстаўшыя не адмаўлялі савецкую ўладу, выступаючы супраць мясцовых камітэтаў РКП(б). Напрыклад, актыўную ролю ў паўстаннях у Лоеве (люты 1918) і Карме (1919) адыгралі эсэры[10]. Пры падтрымцы сялян, незадаволеных аграрнай палітыкай бальшавікоў, паўстанцы на нейкі час апанавалі мястэчка, пакуль не былі выбіты і разагнаны рэгулярным войскам. Бальшавікі жорстка каралі нязгодных з іх дыктатурай: войска і аддзелы ЧК падаўлялі паўстанні і выступленні, у тым ліку ў Капылі, Старобіне і іншых мястэчках[11]. Даволі жорстка бальшавікі распраўляліся з сабатажам, кантрабандным гандлем, шынкарствам. Практыкаваліся расстрэлы, напрыклад, у Сіроціне на Віцебшчыне. Увосень 1918 г. за забой-

[9] Шматлікія сведчанні нешляхетных паводзін польскага войска ў 1920 г. на Беларусі захаваліся не толькі ў архівах, але і ў памяці людзей, напрыклад, у вёсках Мазыршчыны. Пэўную цікавасць прадстаўляюць матэрэялы, якія збіраліся яўрэйскімі арганізацыямі падчас адступлення польскага войска ўлетку 1920 г. Па гарачых слядах фіксаваліся выпадкі падпалаў, рабункаў і гвалтаў, якія чыніліся адступаючымі вайсковымі фармацыямі. Факты жорсткасці і злачынстваў польскага войска ў 1919-1920 гг. на Беларусі вельмі актыўна і даволі паспяхова выкарыстоўваліся савецкай прапагандысцкай машынай на працягу 1920-1930-х гг.

[10] *Память, Кармянский район*, Минск 1997, с. 57.

[11] Успаміны Е. Столера, супрацоўніка Слуцкай ЧК аб узброеных выступленнях 1920 г. Апублікаваны ў: І. А. Пушкін, *Узброены супраціў ва Усходняй Беларусі (20-30-я гады ХХ ст.): Дакументы і матэрыялы*, Магілёў 2003, с. 29.

ства местачковага школьнага дзеяча, які актыўна спаганяў рэвалюцыйныя падаткі на будаўніцтва савецкай школы, было арыштавана 12 асоб, палова з якіх была расстраляна, хаця іх адказнасць за забойства не была даказана[12].

У віхуры міжуладдзяў некаторыя мястэчкі аказаліся ізаляванымі ад знешняга свету. Жыццё такіх паселішчаў як Парычы, Шчадрын і іншых паралізавалі выступленні сялян супраць дыктатуры бальшавікоў і крывавая дзейнасць розных палітычных і крымінальных груповак, якія з вар'яцкай жорсткасцю і з незразумелым садызмам вынішчалі яўрэяў, нягледзячы на пол і ўзрост. Пакінуць мястэчка для гандляра ці саматужніка было небяспечна, бо навакольныя дарогі патруляваліся паўстанцамі. Бальшавікі нічым не маглі дапамагчы, зразумела, немагчыма было размясціць гарнізоны РККА (Рабоче-Крестьянская Красная Армия) у кожным паселішчы.

У гады грамадзянскай вайны розныя антыбальшавіцкія палітычныя групоўкі актыўна скарыстоўвалі антысемітызм у барацьбе з камуністычнай дыктатурай. Абвінавачваючы яўрэяў у сімпатыях да бальшавікоў, розныя банды (ці атрады паўстанцаў) праводзілі шырокую палітычную кампанію сярод навакольнага сялянства. Так, пагромы ў вялікім ці малым мястэчку суправаджаліся не толькі гвалтамі, фізічным знішчэннем людзей (забівалі як яўрэяў, так і западозраных у лаяльнасці да саветаў), падпаламі, але і тлумачальнай працай сярод жыхароў аб калектыўнай адказнасці за жахі харчраскладкі.

Натуральна, што нягледзячы на разбурэнне мясцовай гаспадаркі, у тым ліку дзякуючы захадам ваеннага камунізму, яўрэйская супольнасць мястэчак вымушана была падтрымаць станаўленне ўлады бальшавікоў, у якіх бачылі заступнікаў у часе жахлівых пагромных акцый[13]. На самой справе, нават калі ствараліся адзінкі яўрэйскай самапомачы, якія маглі даць адпор пагромшчыкам, камуністы і прадстаўнікі Чырвонай Арміі не спяшылі забяспечыць іх зброяй. Напэўна, выяўлялася падазронасць бальшавікоў да розных парамілітарных атрадаў, якіх так многа ўзнікла ў гады грамадзянскай вайны пры дапамозе саміх бальшавікоў і якія вельмі часта паварочвалі зброю супраць былых хаўруснікаў. Так, яўрэі Любані атрымалі некалькі вінтовак і наганаў і, зразумела, не змаглі супрацьстаяць моцным і арганізаваным навакольным бандам. Пагром у Любані ў 1921 г. вызначаўся садысцкай жорсткасцю захапіўшых мястэчка пагромшчыкаў[14]. Ацалелыя яўрэі бяжалі ў Слуцк

[12] *Еврейское местечко в революции. Очерки*, под ред. В. Г. Тана-Богораза, Москва 1926, с. 100.

[13] О. Будницкий, *Российские евреи между красными и белыми*, Москва 2005, с. 178.

[14] *Памяць. Любаньскі раён*, с. 73.

пад ахову моцнага гарнізона РККА, дзе мясцовыя ўлады заставілі іх выконваць розныя працоўныя павіннасці. Самапомач Шчадрына і Парыч актыўна бараніла ўласныя паселішчы, але, напрыклад, спачатку ў шчадрынскі яўрэйскі атрад дапускаліся толькі камуністы і камсамольцы, толькі пазней прымаліся і непартыйныя. Як толькі небяспека мінула, атрады былі адразу расфарміраваны[15]. Найбольш актыўныя ўдзельнікі ўліваліся ў атрады ЧОН (часткі асобага назначэння), якія не толькі вылаўлівалі бандытаў, але пацыфікавалі сялянства, высялялі сем'і паўстанцаў з Беларусі. Частка моладзі мястэчак, вярнуўшыся з франтоў імперыялістычнай, грамадзянскай, польскай вайны, не ведала іншага занятку як ваяваць і забіваць[16].

Атрымаўшы ўладу, бальшавікі не цярпелі ўчарашніх палітычных хаўруснікаў ці партый і арганізацый, якія ставіліся да іх зычліва ці нейтральна. На Беларусі быў распушчаны Бунд, папулярны сярод працоўных слаёў мястэчак, рэпрэсіі зведалі эсэры, якія карысталіся аўтарытэтам сярод сялянства[17]. Актыўныя захады савецкі рэжым прымаў супраць сіяністаў, прадстаўнікоў рэлігійнага кліру. Спецыфікай мястэчак і гарадоў былой рысы аселасці было тое, што рабіць рэвалюцыю на „яўрэйскай вуліцы"[18] бальшавікі дазволілі самім яўрэям. Менавіта супрацоўнікі яўрэйскіх устаноў вызначаліся большай нецярпімасцю да іудаізму, яўрэйскіх традыцый, сіяністычнага руху[19].

Прадстаўнікі яўрэйскага этнасу прываблівалі ўвагу разнастайных партыйных і савецкіх устаноў, праводзячых у жыццё т.зв. савецкую нацыянальную палітыку. З 1918 г. на беларускіх землях дзейнічаў шэраг такіх устаноў, разлічаных на прыцягненне да бальшавікоў этнічных меншасцей: нацыянальныя секцыі, бюро і іншае[20]. З часоў усталявання ўлады бальшавікоў у мястэчках і гарадах т.зв. праца (шэраг грамадскіх, антырэлігійных, палітыка-асветных кампаній) канцэнтравалася паміж іншым у руках т.зв. яўсекаў (служачых яўрэйскіх бюро, секцый, упаўнаважанных). Супрацоўнікі яўрэйскай секцыі, у мінулым сябры

[15] І. А. Пушкін, *Узброены супраціў ва Усходняй Беларусі...*, с. 38.

[16] Аб такім становішчы ўзгадваў жыхар Парыч Пётр Сяўрук: на пачатку 1920-х гадоў у мястэчку не было ніякай працы, акрамя некалькіх ацалелых майстэрняў рамеснікаў, а ў дому панавала галеча. Таму ён па прапанове мясцовых камуністаў пайшоў у ЧОН (*Памяць. Светлагорскі раён*, с.148).

[17] Я. Мірановіч, *Найноўшая гісторыя Беларусі*, Санкт-Пецярбург 2003, с. 57.

[18] „Яўрэйская вуліца" (з ідыш: „yidishe gas") — тэрмін, якім часта характарызавалі яўрэйскі асяродак, яўрэйскую супольнасць паселішчаў.

[19] Z. Gitelman, *Jewish Nationality and Soviet Politics: The Jewish Sections of the CPSU, 1917-1930*, Princeton 1972, p. 106.

[20] Апарат правядзення нацыянальнай палітыкі ў савецкіх рэспубліках быў вельмі грамоздкі, часам розныя ўстановы паўтаралі тыя ж самы функцыі, якія выконвалі іншыя нацыянальныя ўстановы. *Политика Советской власти по национальным делам за три года. 1917 — ноябрь 1920*, Москва 1920, с. 7-15.

розных сацыялістычных яўрэйскіх партый, накіроўваліся з буйных гарадоў у мястэчкі, дзе рабілі захады па заснаванні савецкіх грамадскіх арганізацый, наладжванні палітычных і культурна-асветных мерапрыемстваў сярод мясцовых яўрэяў, адначасова даводзячы да паступовага руйнавання традыцыйна-рэлігійнага жыцця[21]. Яўсекі сталі той сілай, якая на думку ўлады павінна была рэканструяваць традыцыйнае мястэчка, вынішчаючы традыцыйную сістэму адукацыі (хедэры, талмудторы), праследуючы равінаў і іншых дзеячаў рэлігійнага культу (рэзнікаў, старастаў сінагог). Як сведчаць архіўныя крыніцы, у першыя паслярэвалюцыйныя гады праца яўсекаў у малых мястэчках праходзіла наступным чынам. З уезднага цэнтра ў мястэчка прыязджаў супрацоўнік, валодаючы ідыш, арганізоўвалі мітынг ці агульны збор яўрэйскага насельніцтва[22]. Пасля дакладаў аб міжнародным становішчы і задачах партыі, ён ехаў у наступнае мястэчка, а жыццё зноў ішло як і раней.

Больш арганізаваная і грунтоўная палітыка-выхаваўчая праца з местачкоўцамі пачалася з сярэдзіны 1924 г. Гэта было выклікана новым курсам у савецкай нацыянальнай палітыцы. На Беларусі, як і на іншых землях былой рысы аселасці яўрэяў прагучаў заклік партыі „Тварам да мястэчка". Савецкая прапаганда падала гэта як клопат партыі і ўрада аб гаспадарчых і культурных патрэбах яўрэйскага насельніцтва такіх паселішчаў. На самой справе гэта азначала пачатак планавага ўключэння местачкоўцаў у савецкае будаўніцтва і фарміраванне новага грамадства. На гэты раз яўсекі і партыйныя функцыянеры больш грунтоўна ставіліся да „выкаранення перажыткаў старой эпохі". Прыехаўшыя актывісты прымалі жорсткія захады супраць равінаў ці „непралетарскіх" груп моладзі. Новапрыбыўшыя дзеячы працавалі як арганізатары піянерскіх дружын, клубаў, стваралі мясцовыя аматарскія тэатральныя групы.

Нацыянальная моўная палітыка бальшавікоў у мястэчках мела месца ў напрамках ідышызацыі і беларусізацыі. Ідыш выконваў істотную ролю ў жыцці местачковых яўрэяў, з'яўляючыся матчынай мовай, сродкам камунікацыі. У 1920-я гады ён атрымаў афіцыйны статус адной з чатырох дзяржаўных моў БССР. Ідышызацыя стала важным момантам развіцця яўрэйскага нацыянальна-культурнага жыцця па савецкай мадэлі[23]. Забарона іўрыта (старажытнаяўрэйскага, які лічыўся мовай

[21] У часы нэпа само цэнтральнае кіраўніцтва перасцерагала ад гвалтоўных захадаў па зачыненню сінагог, цэркваў. Ініцыятыва павінна была быць перададзена мясцовым камсамольцам ці групам савецкіх актывістаў.

[22] Протоколы заседания губевсекции РКП(б). Июнь 1922 г., Дзяржаўны архіў грамадскіх арганізацый Гомельскай вобласці (далей: ДАГАГВ), ф. 1, воп. 1, спр. 1712, арк. 19, 22.

[23] Даволі грунтоўна праблема даследавана ў: E. Bemporad, *The Yiddish Experiment in Soviet Minsk*, „East European Jewish Affairs", vol. 37, no. 1, April 2007, pp. 91-107.

клерыкалаў), абмежаванне культурных сувязей замежнымі яўрэйскімі супольнасцямі, спробы бальшавікоў рэфармаваць ідыш (як і іншыя мовы) — усё гэта вяло да таго, што ідышызацыя была толькі пераходным момантам у саветызацыі яўрэйства былой рысы аселасці. Жыццё паказала, што сталінскі рэжым пайшоў на скарачэнне ўжытку ідыш ужо ў другой палове 1930-х гадоў, калі зачыняліся яўрэйскія школы і мястэчковыя саветы, а сам ідыш мог быць афіцыйнай мовай толькі ў асяродку „савецкай яўрэйскай дзяржаўнасці" — Бірабіджане ( з 1934 г. — Яўрэйскай аўтаномнай вобласці)[24].

Беларусізацыя стала важным элементам, паўплываўшым на жыццё насельніцтва БССР у часы нэпа. Нацыянальнае адраджэнне беларускай супольнасці было відавочнае ў грамадскім, палітычным і культурным жыцці мястэчак. Зараз беларусы маглі вольна карыстацца роднаю мовай у мясцовай адміністрацыі, розных савецкіх установах (судзе, зямельных установах). Іншай справаю было тое, што пэўная частка адміністрацыі „не разумела" як і раней беларускай мовы, што выклікала зразумелую незадаволенасць беларускай супольнасці. Крыніцы сведчаць аб тым, што гэтая праблема разглядалася цэнтральнымі ўладамі ў Мінску, дэкларавалася барацьба з т.зв. вялікадзяржаўным расійскім нацыяналізмам. Трэба адзначыць, што негатыўнае стаўленне савецкіх клеркаў да беларускай мовы было больш характэрна для буйных гарадоў, асабліва на далучаных да БССР у 1924-1926 гадах частках Віцебшчыны, Магілёўшчыны і Гомельшчыны[25].

Пэўную незадаволенасць пашырэннем ужытку беларускай мовы выказвалі служачыя рускія, як і русіфікаваныя беларусы ці яўрэі. Выяўляўся пэўны ўплыў дарэвалюцыйнай вялікарускай пагарды да ўсяго „мужыцкага". У малых мястэчках асноўная частка старой служачай інтэлігенцыі страціла працу яшчэ ў гады ваеннага камунізму як „сабатажнікі". У выніку змены статуса некаторых мястэчак, калі скасоўваліся паветы і скарачалася сетка адміністрацыйных устаноў, некаторыя служачыя выехалі ў іншыя гарады ці за межы Беларусі. Такі працэс быў адзначаны ў былых павятовых гарадах, а фактычна мястэчках, у Сянне, Чэрвені і Дрысе[26].

Адным з напрамкаў нацыянальнай палітыкі бальшавікоў было прадстаўленне этнічным меншасцям пэўнай моўнай аўтаноміі ў выбарных

[24] Развіццё Бірабіджанскага праекта як пэўны этап у жыцці савецкіх яўрэяў даследавана ў працах: A. Patek, *Birobidżan. Sowiecka ziemia obiecana? Żydowski Obwód Autonomiczny w ZSSR*, Kraków 1997.

[25] А. С. Замойскі, В. П. Пічукоў, *Нацыянальная праца з рускім насельніцтвам БССР у 20-ыя гады*, [у:] *Матэрыялы навуковай канферэнцыі „Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць"*, Мінск 2002, с. 216-220.

[26] *Мястэчкі у рэканструкцыйны перыяд*, Менск 1932, с. 17.

савецкіх установах. Афіцыйна местачковыя яўрэйскія саветы, як і іншыя нацыянальныя саветы, ствараліся ў паселішчах, дзе кампактна пражывалі этнічныя меншасці, каб забяспечыць іх грамадскія, культурныя правы, вырашаць паўсядзённыя праблемы. На справе менавіта гэтым органам належала пэўная палітычная мэта — спрыяць саветызацыі яўрэяў, палякаў, літоўцаў, латышоў, улічваючы пэўную мясцовую этнічную спецыфіку. Гэтыя выбарныя органы павінны былі працаваць на роднай мове насельніцтва, якое абслугоўвалі. Стварэнне гэтых устаноў прапагандавалася як дасягненне савецкай нацыянальнай палітыкі, чаго, зразумела, не было ў суседніх з СССР краінах, дзе кампактныя групы этнічных меншасцей не маглі нават марыць аб такой аўтаноміі. Жыхар мястэчка мог ужываць ідыш, польскую ці беларускую і рускую мовы калі трэба было варашыць нейкія паўсядзённыя праблемы. У 1928 годзе на Беларусі дзейнічаў 21 яўрэйскі местачковы савет з 56 мястэчак[27].

Выбары ў мясцовыя саветы падаваліся савецкай прапагандай як значнае дасягненне савецкай дэмакратыі. З аднаго боку, колькасць выбаршчыкаў значна павялічвалася ў параўнанні з дарэвалюцыйным часам, з іншага — бальшавікі з 1918 г. зрабілі пэўныя абмежаванні ў дачыненні пэўных груп насельніцтва, якія не маглі браць удзелу ў выбарах. Пазбаўленне выбарчых правоў тычылася ўсіх тых, каго бальшывікі лічылі нелаяльнымі да ўласнага рэжыму, а пазней і недастаткова добранадзейнымі. Кола т.зв. „пазбаўленцаў" ахапіла не толькі прадстаўнікоў былых класаў эксплуататтараў ці тых, хто супрацьстаяў бальшавікам падчас станаўлення іх улады. Улада з дамамогай Дзяржаўнага палітычнага ўпраўлення (ДПУ) кантралявала склад дэпутатаў, адсейваючы палітычна нядобранадзейных. Сябрамі саветаў маглі стаць рабочыя, служачыя, чырвонаармейцы і „свядомыя" рамеснікі. Адсотак партыйных дэпутатаў з году ў год павялічваўся, але ў цэлым камуністы не мелі больш адной трэці пасад у саветах. Сябрамі саветаў станавіліся жанчыны[28].

У малых мястэчках, набыўшых статус сельскіх паселішчаў, дзейнічалі сельскія саветы. У сельсаветах яўрэі займалі малую колькасць выбарных пасад, таму што большасць выбаршчыкаў складалі сяляне з навакольных вёсак. Слабое прадстаўніцтва аднаго этнаса, адсутнасць палітычнай культуры вяло да таго, што правы этнічнай меншасці не ўлічваліся мясцовымі выбарчымі органамі. Такая сітуацыя склалася ў мястэчку Лапічы. Мясцовы сельсавет амаль не адлюстроўваў інтарэсаў

[27] Список национальных советов Белорусской СССР (конец 1928), НАРБ, ф. 701, воп. 1, спр. 92, арк. 175.

[28] У 1926-1927 гг. старшынямі местачковых саветаў выбрана 3 жанчыны. *Дзейнасць Ураду БССР. 1928-1929гг.*, Минск 1929, с. 261-262.

яўрэйскага насельніцтва мястэчка, нягледзячы на тое, што ў гэтым органе было 2 супрацоўнікаў яўрэяў. Па прапанове сялян, сельсавет зачыніў старыя яўрэйскія могілкі. Яўрэі мястэчка хавалі сваіх нябожчыкаў па начах ці за хабар сябрам савета. Каб вырашыць гэту праблему, яны нават звярталіся да раённых улад[29].

Амаль па-за межамі савецкай палітыкі заставаліся татары, якія пражывалі ў такіх мястэчках як Вузда, Капыль, Смалявічы, Смілавічы і інш. Нацыянальна-культурныя інтарэсы гэтага насельніцтва часта не ўлічваліся ні цэнтральнымі ўладамі, ні мясцовымі кіраўнікамі[30]. Польскае насельніцтва вылучалася як аб'ект палітыкі ў Койданаве, дзе ў 1932 годзе стварылі Польскі аўтаномны раён.

Са стабілізацыяй палітычнай і эканамічнай сітуацыі ў часы нэпа цэнтральная ўлада была вымушана шукаць падтрымкі з боку пэўных слаёў мястэчка. Бальшавікі не пераацэньвалі ўласных сіл, яны ведалі, што саветызацыя дробнабуржуазнага насельніцтва мястэчак, гэтых „гандляроў" і „маргіналаў" не будзе лёгкай справай. У цэлым лаяльнае да савецкай улады местачковае насельніцтва не спяшалася прымаць новых норм, актыўна насаджваных дзяржавай, як адыходу ад перажыткаў рэлігіі і традыцый, сімпатыі да сіянізму. Яўрэі мястэчак захоўвалі пэўныя сімпатыі да вольнага рынку, займаючыся дробным гандлем, пасрэдніцкімі аперацыямі і рамяством, што давала пэўную аўтаномію ад дзяржавы, магчымасць не працаваць у суботу і традыцыйныя рэлігійныя святы. Склаўшыся стагоддзямі лад жыцця мястэчка зразумела не супадаў з жаданнем бальшавікоў кантраляваць гаспадарку і будаваць сацыялістычную эканоміку на падставе буйной прамысловасці. Прадстаўнікі партыі, савецкіх устаноў глядзелі на жыхароў мястэчка (як і на вяскоўцаў) як на цёмных і адсталых, якія не разумеюць грандыёзных задач партыі і ўрада, які жадаюць вяртання старых часоў. Сапраўды, некатароя групы жыхароў ідэалізавалі старыя часы, бо была сталая праца. Гэта ў першую чаргу тычылася тых мястэчак, якія моцна пацярпелі ад палітыкі ваеннага камунізму і перабудовы гаспадаркі на новы лад. Так, у Парычах, дзе ліквідавалі лясныя промыслы, даволі яскрава праяўлялася незадаволенасць савецкай рэчаіснасцю. У гады нэпа местачкоўцы часам выступалі супраць „прагрэсіўнага" развіцця савецкай гаспадаркі і грамадства. Калі мястэчкі пераводзілі ў склад га-

[29] Материалы Комиссии ЦК КП(б)Б по обследованию Мозырского округа (весна 1926), Расійскі Дзяржаўны архіў сацыяльна-палітычнай гісторыі (далей: РДАСПГ), ф. 445, воп. 1, спр. 180, арк. 70.

[30] Больш падрабязна аб становішчы татарскай супольнасці мястэчак БССР у 1920-я гады глядзі ў артыкуле: І. Канапацкі, *Ях'я Гембіцкі — лідэр адраджэння беларускіх татар (да 120-й гадавіны з дня нараджэння)*, „Białoruskie Zeszyty Historyczne", nr 23. s. 213-231.

радоў у 1925 г., пэўныя групы „несвядомых” местачкоўцаў Калінкавіч спрачаліся і нават збіралі подпісы, каб захавць папярэдні статус мястэчка[31]. Справа была не столькі ў „палітычнай адсталасці”, колькі людзі не жадалі падвышэння падаткаў на прыватны сектар, бо гараджане плацілі больш. Зразумела, што ўлады не прыслухаліся аргументам гэтай групы, а подпісы былі прызнаны несапраўднымі. Бальшавікі добра ведалі калі трэба ісці на тактычныя ўступкі жыхарам, а калі не.

Разнастайныя ўстановы новай улады спрыялі саветызацыі насельніцтва мястэчак. Ячэйкі партыі і камсамола, ДПУ, міліцыя, пракуратура, мясцовыя прафсаюзы і „дабравольныя” масавыя савецкія грамадскія арганізацыі сталі тым падмуркам, на якім будаваўся савецкі рэжым у мястэчку. Камбеды і рэўкамы саступілі ўладу выбарным установам — саветам, але на самой справе ўсе найважнейшыя рашэнні прымаліся ў камітэце партыі. Партыйцы-камуністы з'яўляліся галоўнай апорай савецкага рэжыму ў мястэчках. Менавіта імі кантраляваліся ўсе важныя пасады — амаль уся афіцыйная эліта раённага мястэчка збіралася на пасяджэнне райкама партыі. Звычайна прысутнічалі прадстаўнікі розных савецкіх і гаспадарчых устаноў, найважнейшых прадпрыемстваў, кіраўнікі мясцовага камсамола. Зразумела, што моцныя пазіцыі камуністы мелі ў мястэчках райцэнтрах, дзе сканцэнтраваліся розныя ўстановы, у той час як у малых мястэчках камуністаў было мала. У Скрыгалаве ў сярэдзіне 1920-х гадоў іх было толькі тры, прычым яны па справах часта выязджалі з мястэчка і аўтэрытэтам не карысталіся[32]. Па звестках яўрэйскай секцыі ў 1926 годзе, «у коммунистов мало друзей в местечке, их можно пересчитать по пальцам»[33]. Таксама цэнтральнае кіраўніцтва было незадаволенае нізкім адукацыйным ўзроўнем мясцовых камуністаў, іх слабымі палітычнымі ведамі, п'янствам і іншым[34].

Больш моцныя пазіцыі ў малых мястэчках мелі камсамольскія ячэйкі. Камсамольцы дзейнічалі нават у малах паселішчах. Падзел мястэчка па сацыяльным становішчы адбіўся на складзе мясцовых ячэек. Партыйныя ўстановы пільна сачылі за развіццём Камуністычнага саюза моладзі (КСМ) у мястэчках. Прадугеджвалася, што сябрамі павінна становіцца працоўная моладзь з сямей рабочых, кааператываных рамеснікаў, з пэўнымі абмежаваннямі і дзеці землярабоў[35]. „Непрацоўная моладзь” пазаставалася па-за дзейнасцю гэтай арганізацыі, часам далучаючыся да сіяні-

[31] *Калінкавічы — горад*, [у:] *Памяць. Калінкавіцкі раён*, с. 160.
[32] Материалы Комиссии ЦК КП(б)Б по обследованию Мозырского округа (весна 1926), РДАСПГ, ф. 445, воп. 1, спр. 180, арк. 68.
[33] Материалы евбюро ЦК КПБ. 15.6.1926, НАРБ, ф. 4, воп. 10, спр. 56, арк. 30.
[34] Работа местечковых ячеек КП(б)Б. Осень 1929, НАРБ, ф.4, воп. 10, спр. 104, арк. 5.
[35] *Работа комсомольской ячейки в местечке*, Москва — Ленинград 1925, с. 22-24.

стаў, якія прызнаваліся „палітычна небяспечным" элементам. Так, у м. Скародным сіяністы ідэалагічна развалілі камсамольскую ячэйку, якая фактычна распалася. Аднак, агульнай тэндэнцыяй быў рост сеткі камсамольскіх ячэек у мястэчках. Для моладзі гэта была часам адзіная магчымасць самарэалізацыі. Будуючы сацыялізм, імкнуліся яны змяніць жыццё краіны (і свайго мястэчка) на лепшае. Камсамольцы не толькі зачынялі цэрквы і сінагогі, праследавалі святароў, але дапамагалі дзецям з ахопленага голадам Паволжа, размяшчаючы іх па дамах, наладжвалі культурную працу, як маглі ліквідавалі непісьменнасць. Пэўная частка з іх верыла ў светлыя ідэалы, выказваючы жаданне сумленна служыць сваёй краіне, што было выкарастана партыяй зусім у іншых кантэкстах.

Прафсаюзы разглядаліся партыйным кіраўніцтвам у якасці аднаго з падмуркаў савецкай улады[36]. Спецыфікай іх развіцця ў мястэчках была нездавальняючая колькасць «пралетарыяў». Таму гэтыя ўстановы аб'ядноўвалі прадстаўнікоў розных прафесій, як кааперованых рамеснікаў, так змагрыналізаваных рабочых (працуючых сезонна, напрыклад, будаўнікі)[37]. У палітычным сэнсе рабочая бедната карысталася большай павагай улады, чым іншыя группы насельніцтва. Для ўзмацнення працы прафсаюзаў і саветызацыі іх сябраў, праца некаторых устаноў будавалася на выкарастанні ідыш. У мястэчках Віцебшчыны ён ужываўся такімі «яўрэйскімі» саюзамі як шаўцоў і будаўнікоў[38]. Адносна моцныя саюзы былі ў раённых мястэчках, дзе знаходзілася іх раённае кіраўніцтва, якое непасрэдна кіравалася загадамі акруговых і рэспубліканскіх устаноў.

З гэтай мэтай ужываўся дыферэнцыяваны падыход да розных груп насельніцтва. Улада спрабавала абаперціся на найбольш лаяльнае насельніцтва. Асноўнай палітычнай і сацыяльнай апорай савецкага рэжыму ў мястэчках павінен быў стаць пралетарыят. У савецкай дактрыне пралетарыі (рабочыя, пэўныя катэгорыі служачых) супрацьпастаўляліся дамінуючаму «дробнабуржуазнаму» насельніцтву (сялянам, рамеснікам, прадстаўнікам былых «эксплуатуючых» класаў). Менавіта т.зв. пралетарыі з'яўляліся паўнапраўнымі савецкімі грамадзянамі, сябрамі прафсаюзаў, мелі пэўныя льготы ў падаткаабкладанні. Ад імя пралетарыяту бальшавікі вяршылі сваю дыктатуру.

[36] Вядомы савецкі лозунг „Прафсаюзы — школы камунізму". На самой справе прафсаюзы бралі пад свой кантроль ідэалагічны, культурны бок жыцця сваіх сябраў. Сябры прафсаюзаў у першую чаргу прыцягваліся на розныя палітычныя і гаспадарчыя кампаніі.

[37] Прафсаюз аб'ядноўваў рабочых саўгасаў і прадпрыемстваў мясцовай прамысловасці.

[38] Отчет Витебской национальной секции. Сентябрь 1926 г., НАРБ, ф. 701, воп. 1, спр. 72, арк. 49.

Рабочыя павінны былі стаць надзейнай апорай савецкай улады, але на самой справе гэтая група ў мястэчках была давольна пасіўнай у грамадскім жыцці і на думку камуністаў «слаба ўцягнута ў палітыччнае і савецкае жыццё»[39]. Па-першае, у большасці мястэчак амаль не было палітычна арганізаванага і свядомага пралетарыяту. Рабочыя мястэчак у пераважнай большасці гэта былыя сяляне ці беспрацоўныя, страціўшыя заробак у выніку ліквідацыі ці знішчэння пэўных прадпрыемстваў, галін гаспадаркі яшчэ ў гады ваеннага камунізму.

Прымаючы пад увагу пэўную палітычную слабасць т.зв. „пралетарыяту" ў мястэчках, бальшавікі былі вымушаны супрацоўнічаць з саматужнікамі, якія скаладалі найбольш уплывовую групу насельніцтва мястэчак. Местачковыя саматужнікі актыўна рэагавалі на падатковы ціск, несправядлівыя адносіны з боку мясцовых кіраўнікоў. На мясцовых і акружных з'ездах дэлегаты-рамеснікі даволі рашуча адзначалі факты слабай працы савецкіх устаноў (мясцовых саветаў, шпіталяў і савецкіх школ). Так, у 1925 годзе мінскія камуністы выступленні некаторых рамеснікаў на з'ездах трактавалі як „антысавецкія". Менавіта саматужнікі мястэчка з'яўляліся носьбітамі яўрэйскіх нацыянальных традыцый. Гэта было звязана таксама з тым, што многія рамёствы перажывалі крызіс падчас нэпа, моладзь імкнулася да „гарадскіх" прафесій, а сярод саматужнікаў у многіх мястэчках пераважалі людзі старэйшага ўзросту. Бальшавіцкае кіраўніцтва спрабавала ўзяць пад свой кантроль гэтую групу местачкоўцаў шляхам гаспадарчай дапамогі, аслабіць сярод іх уплыў сіяніцкіх гурткоў. Важнай задачай цэнтральнага кіраўніцтва было стрымаць незадаволенасць саматужнікаў і гандляроў падаткавай палітыкай. Дзяржава пайшла не толькі на актыўную прапаганду падаткавых паслабленняў у дачыненні працоўнага насельніцтва, але на стварэнне таварыстваў рамеснікаў амаль ва ўсіх мястэчках. Такія таварыствы аб'ядноўвалі незаможных вытворцаў, прадастаўляючы ім крэдыты і дапамогу ў атрыманні сыравіны.

Лаяльнай да савецкай улады групай насельніцтва мястэчка былі служачыя. У мястэчках былі яны прадстаўлены разнастайнымі прафесіямі. У савецкай рэчаіснаці гэта была вельмі шырокая група, яка аб'ядноўвала звычайнага савецкага клерка, настаўніка, дырэктара школы, працаўніка райвыканкама і інш. Партыйнае кіраўніцтва адзначала, што сярод яўрэйскай інтэлігенцыі, асабліва настаўнікаў, магчыма развіццё нацыянальных памкненняў, што „можа праявіцца ў сіянізме". Зразумела, што ў час нэпа пэўная частка яўрэйскіх настаўнікаў у мястэчках спрыяла сіяністычным ідэям, але паступова склад школ абнаўляўся за

[39] Тезисы по докладу о состоянии еврейского населения местечек БССР по материалам обследования комиссии ЦК (Лето 1926), НАРБ, ф. 4, воп. 3, спр. 14, арк. 715.

кошт новых педагагічных кадраў, якія былі выхаваны ў патрэбным для ўлады „пралетарскім духу". Служачыя дзяржаўных устаноў у мястэчку амаль заўсёды прыцягваліся да грамадскай працы сярод насельніцтва (асабліва настаўнікі). Павінны яны былі браць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы да рэвалюцыйных свят і розных палітычных кампаній. Зразумела, што група служачых была шматлікай у мястэчках цэнтрах раёнаў, дзе змяшчаліся розныя савецкія, гаспадарчыя, культурныя і адукацыйныя ўстановы. У малых мястэчках колькасць служачых не была вялікай, пэўная частка з іх была прыезджай, накіраванай з акругі ці раёна для ўзмацнення мясцовых устаноў. У некаторых малых мястэчках нават у другой палове 1930-х гадоў большасць служачых складалі прыезджыя, што магло сведчыць не толькі аб слабай кваліфікацыі мясцовых кадраў, але аб пэўным недаверы з боку цэнтральных органаў улады да мясцовага апарату.

Сялянства не ўяўляла палітычна актыўнай групы насельніцтва мястэчак, нават калі ўяўляла значную колькасць жыхароў. Улада ставілася да гэтай групы з пэўным недаверам, як да носьбіта дробнабуржуазных поглядаў. Самім жа „непралетарскім элементам" (гандлярам, пасрэднікам, заможным рамеснікам, дэкласаваным жыхарам, служачым кліру) пралетарскай дзяржавай адводзілася роля спецыфічнага баласту, які павінен быў заставацца на ўзбочыне сацыялістычнага будаўніцтва, часткова перавыхавацца ў карысных для партыі і савецкай улады грамадзян. Але, каб набыць пажаданы сацыяльны статус, трэба было ім заняцца сельскай гаспадаркай у рамах „яўрэйскіх" праектаў перасялення ў Крым, Бірабіджан, ці яўрэйскія калгасы ў межах Беларусі.

Адносіны цэнтральнай і мясцовай улад да насельніцтва мястэчак да пэўных груп сельскага і гарадскога насельніцтва часам не супадалі. Партыйнае кіраўніцтва вымушана было прызнаць, што ў правінцыі назіраліся выпадкі тэндэнцыйнага падыходу некаторых партыйных і савецкіх работнікаў да этнічных меншасцей, адзначалася агульная прыкмета яўрэяў як „торгашей", палякаў як „паноў-контррэвалюцыянераў", латышоў і літоўцаў як „кулакоў"[40]. Мясцовыя кіраўнікі часам наогул не разумелі як трэба сябе „паліткарэктна" паводзіць з насельніцтвам. Вельмі часта ад прадстаўніка райвыканкама залежала як трактаваць прадстаўнікоў местачковай яўрэйскай супольнасці (як працоўных ці непрацоўных), што адбівалася на падаткаабкладанні, занясенні сям'і ў спіс пазбаўленых грамадзянскіх правоў. Асабліва непакоіла партыйнае кіраўніцтва рэспублікі самаўпраўства фінансавых інспектараў, якія вызначалі памеры падаткаў з жыхароў, а часам фактычна тэрарызавалі

[40] Матэрыялы прадстаўленыя ЦК КП(б)Б аб нацыянальнай палітыцы ў БССР. 1925, НАРБ, ф. 4, воп. 3, спр. 15, арк. 54.

насельніцтва штрафамі і канфіскацыямі. ЦК КП(б)Б прапанавала нават правесці некалькі паказальных судоў над фінінспектарамі, якія злоўжываюць уладай[41].

Самабытнасць мястэчка была ў тым, што дробным гандлем займаліся не толькі гандляры, але і іншыя групы жыхароў (рамеснікі, рабочыя, беспрацоўная беднната). Для мясцовых улад не было ніякай розніцы хто і чаму вымушаны быў гандляваць. З марксісцкага пункту гледжання гэта было непрацоўным заняткам, адсюль і пачаткова мясцовыя ўлады м. Валынцы (Полацкая акруга) забаранілі мясцовым яўрэям быць сябрамі мясцовх каапературываў. Матывацыя была самая простая — яўрэі займаюцца спекуляцыяй[42]. Саматужнік, які прадаваў свае вырабы трактаваўся як спекулянт, што адбівалася на падаткабкладанні яго сям'і, жорсткім спагнанні падаткаў, пазбаўленні выбарчых правоў. З іншага боку, яшчэ з часоў ваеннага камунізму, улада абвінавачвала местачкоўцаў у спекуляцыі (фактычна вольным гандлі), які перашкаджаў усталяванню сацыялістычнай размеркавальнай сістэмы. Яўрэі мястэчак, карыстаючыся старымі камерцыйнымі сувязямі з навакольнымі вёскамі, самі наладзілі тавараабмен з сялянамі. Земляробам больш карысна было прадаць зерне на чорным рынку, чым аддаць задарма пралетарскай дзяржаве. У адказ бальшавікі каралі і тых, і іншых. Шырока распаўсюдзілася практыка кардонаў на сельскіх шляхах, якія перахоплівалі вазы з зернем. Нават, калі пачаў ажыццяўляцца нэп, местачкоўцы першы час не давяралі прапагандзе, лічачы, што гэта адна з тактычных хітрыкаў бальшавікоў, каб, прыкрываючыся лозунгамі аб свабодным гандлі, выяўляць і канфіскаваць тавары.

Нават з пэўнай лібералізацыяй нэпа мясцовыя кіраўнікі не спяшаліся развітацца з метадамі працы, якімі шырока карысталіся ў часы ваеннага камунізму. У 1923 годзе ў шэрагу мястэчак, напрыклад, на Палессі, у яўрэяў масава канфіскаваліся зямельныя надзелы, што выклікала незадаволенасць нават супрацоўнікаў яўрэйскіх секцый[43]. Мясцовае кіраўніцтва тлумачыла гэта неабходнасцю эканамічнага абмежавання мясцовай буржуазіі. На самой справе цярпелі дробныя гандляры, рамеснікі і беспрацоўныя.

Стасункі паміж уладай і насельніцтвам мястэчак ускладняліся рознымі момантамі, сярод якіх можна вылучыць складанасць міжэтніч-

[41] *Аб нацпалітыцы. Рэзалюцыі пленуму ЦК КП(б)Б. Кастрычнік 1925 году*, [у:] *Пастановы і рэзалюцыі Ўсе КП(б) і КП(б)Б па нацыянальным пытанні*, Менск 1926, с. 60.

[42] Отчет еврейского бюро Полоцкого округа. Конец 1924, НАРБ, ф. 4, воп. 10, спр. 38, арк. 7.

[43] Матэрыялы прадастаўленыя Мазырскім яўрэйскім бюро (снежань 1923), РГАСПІ, ф. 445, воп. 1, спр. 144, арк. 45.

ных адносін на беларускіх землях. Самаўпраўства мясцовага кіраўніцтва даходзіла часамі да таго, што выклікала абурэнне жыхароў мястэчак, якім здавалася, што савецкія супрацоўнікі мала чым адрозніваюцца ад прадстаўнікоў царскай адміністрацыі. Нетактычнасць у паводзінах да этнічных меншасцей, хамства савецкіх клеркаў маглі ўспрымацца як нацыянальны ўціск. Яўрэі Сянно скардзіліся ў сваім лісце да кіраўніцтва рэспублікі на старшыню местачковай улады Навуменку, які дазваляў сабе прылюдна антысеміцкія выказванні, лаянкі ў адрас яўрэяў, якія, па яго словах, „не жадалі плаціць падаткі цару Мікалаю, не жадаюць плаціць савецкай уладзе”[44]. Местачкоўцы характызавалі Навуменку як заўзятага антысеміта[45]. На жаль, невядома якія захады прыняў цэнтральны ўрад да Навуменкі, але верагодна, што ён страціў пасаду. Другая палова 1920-х гадоў характарызавалася ўзмоцненай барацьбой з антысемітызмам, які набыў вельмі шырокія маштабы ў савецкім грамадстве. Сацыяльна-эканамічная трансфармацыя гаспадаркі і грамадства, адмена прававых, сацыяльных абмежаванняў у адносінах да яўрэяў, міграцыя іх з мястэчак у буйныя гарады[46], шырокае прадстаўніцтва гэтага этнаса ў партыйных, савецкіх, гаспадарчых і культурных установах, дэфіцыт розных тавараў у выніку вынішчэння прыватнага гандлю, надзяленне яўрэяў зямлёй, высокі адсотак яўрэяў сярод студэнтаў прэстыжных спецыяльнасцей[47] — выклікала незадавальненне пэўнай часткі насельніцтва тым, што яўрэі вельмі актыўна карыстаюцца вынікамі бальшавіцкай рэвалюцыі. Трэба дадаць, што ў 1925 г. ЦК КПБ пастанавіла забараніць ужыванне слова „жыд”, а абвінавачаным у антысемітызме мог быць не толькі заядлы антысеміт, які цкаваў яўрэяў, але неадукаваная асоба, якая па „старой звычцы” ўжывала забароненае слова. Трэба адзначыць, што судовыя справы антысемітаў шырока адлюстроўваліся ў савецкай прэсе (напрыклад, „справа Баршай” — цкаванне маладой яўрэйкі рабочымі адной з фабрык; вінаватыя былі прысуджаны да сур’ёзнага пакарання). Палітычныя кампаніі супраць антысемітаў далі пэўны вынік, але не ліквідавалі тых асноў, якія спрыялі міжнацыянальнай напружанасці — жудасныя

[44] У часы нэпа назіраліся выпадкі, калі местачковыя гандляры наўмысна змяншалі памеры сваёй камерцыйнай актыўнасці, каб пазбегнуць пераабкладання і атрымаць больш танны патэнт.

[45] Скарга жыхароў Сянно яўрэйскай нацыянальнасці ў ЦК КПБ(б). 17 мая 1925, НАРБ, ф. 4, воп. 10, спр. 30, арк. 24-24адв.

[46] Асабліва гэта непакоіла масквічоў і ленінградцаў. Падрабязна гл.: М. Бейзер, *Евреи Ленинграда. 1917-1939. Национальная жизнь или советизация*, Москва 1999, с. 81.

[47] Яўрэі зноў характарызаваліся як спекулянты, таму што ўздымаюць цэны, але падатак на прыватныя ўстановы быў значна вышэйшы чым на кааперацыйны і дзяржаўны сектар.

бытавыя ўмовы працы на савецкіх прамысловых установах, несправядлівае пераразмеркаванне тавараў і даброт у савецкім грамадстве, пагардлівыя адносіны бальшавікоў да вёскі, прыкрытыя фразеалогіяй аб „змычцы сялянства і пралетарыяту”.

Важным момантам у грамадскім жыцці мястэчак стала распаўсюджванне дзейнасці агульнасаюзных грамадскіх арганізацый. Цэнтральнае кіраўніцтва патрабавала ад мясцовых партыйных і савецкіх служачых пільна сачыць за дзейнасцю мясцовых ячэек МОПР[48], Асавіяхіма (Таварыства садзеяння абароне, авіяцыйнаму і хімічнаму будаўніцтву), таварыства „Прэч непісменнасць” і інш. Сябрамі савецкіх масавых арганізацый у першую чаргу сталі прадстаўнікі т.зв. актыву — мясцовыя камуністы, камсамольцы, настаўнікі і інш. Пад уплывам актыўнай прапаганды колькасць сябраў гэтых арганізацый павялічвалася. Напрыклад, у м. Вузда мясцовыя земляробы былі вымушаны запісацца ў МОПР падчас аднаго са сходаў, на якім вырашаліся важныя пытанні падаткаў. Двух мясцовых актывістаў выступілі з прапановай далучыцца да гэтай арганізацыі, што „павінна дапамагчы ўсім палітычным вязням у капіталістычных краінах”[49]. Новыя сябры арганізацыі мелі вельмі мутнае ўяўленне аб задачах і дзейнасці МОПР, аднак гэтая арганізацыя налічвала найбольшую колькасць сябраў у гэтым мястэчку.

Палітызацыя грамадскага жыцця была цесна звязана з мілітарызацыяй краіны Саветаў. Насельніцтва па падказцы „зверху” перыядычна збірала грошы на патрэбы РККА, ваеннай прамысловасці, удзельнічала ў розных палітычных кампаніях. Пэўны адбітак на стасунках улады да насельніцтва мястэчак пакінуў ваенна-стратэгічны фактар. Палова акруг рэспублікі былі пагранічнымі, а ў пагранічным рэгіёне палітыка Саветаў мела больш выразныя рысы т.зв. кнута і перніка. З аднаго боку ўлады пільна сачылі за нядобранадзейным элементам (пэўную ролю тут адыгралі не толькі органы ДПУ, але і пагранічнае войска). Таксама шырока практыкавалася дэпартацыя і высяленне кантрабандыстаў, абшарнікаў, бандыцкіх і паўстанцкіх сем’яў за межы БССР. З іншага боку бальшавікі былі вымушаны ўзмацняць палітычную працу сярод працоўнага насельніцтва, накіроўваючы найбольш адданых справе Леніна савецкіх і партыйных супрацоўнікаў[50]. Цэнтральнае і мясцовае кіраўніцтва рабіла інвестыцыі ў развіццё сістэмы адукацыі і культуры, аховы здароўя на пагранiччы больш рашуча, чым у глыбінных раёнах БССР. Мястэчка стала цэнтрам палітычных кампаній сярод навакольнага сялянства.

[48] МОПР — Міжнародная арганізацыя дапамогі рэвалюцыянерам.

[49] Протокол № 1 собрания земледельцев м. Узды. 4.01.1925, Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці, ф. 29, воп. 1, спр. 62, арк. 2.

[50] Такі ідэалагічны „дэсант” прыбыў у памежнае Койданава.

Спецыфіка мястэчак назіралася таксама ў ідэалагічнай сферы. На думку некаторых камуністаў, мястэчка было цэнтрам, у якім распаўсюджваліся разнастайныя чуткі, якія вельмі часта магчыма было класіфікаваць як антысавецкія. Гомельскі губернскі камітэт у сярэдзіне 1920-х гг. адзначаў, што сяляне, прыязджаючы ў мястэчка да знаёмага крамніка, адначасова пазнаюць апошнія звесткі і навіны. Местачкоўцы не толькі перадавалі весткі і чуткі, але таксама інтэрпрэтавалі іх згодна свайму светапогляду. ДПУ па магчымасці сачыла за цыркуляцыяй чутак, зразумела, што і спрабавала адшукаць тых, хто іх актыўна распаўсюджваў. Адны з самых распаўсюджаных чутак з 1920-х гадоў — гэта чаканне вайны. Па Мазыршчыне, напрыклад, падчас крызісаў партыі прайшлі паведамленні пра паўстанне Троцкага супраць Сталіна, прычым Троцкага падтрымалі рэвалюцыйныя маракі і іншыя[51]. Чуткі былі звыклым з'явішчам у паўсядзённым жыцці мястэчка часоў нэпа. Верагодна, ДПУ часам цяжка было адсочваць аўтараў т.зв. вуснай газеты. Змітрок Бядуля, прыехаўшы ў Койданава, адзначаў, што адразу паўстала чутка, што ён з'яўляецца нейкім грамадскім дзеячам ці журналістам. Людзі пачалі падыходзіць да яго, жаліцца на свае разнастайныя праблемы[52].

На выпадак вайны Беларусь павінна была стаць тэатрам баявых дзеянняў. Кіраўніцтва рэспублікі не было да канца ўпэўнена, што насельніцтва павядзе сябе пэўным чынам падчас вайны. Ліквідацыю і перавыхаванне незадаволенных савецкай уладай трэба праводзіць паўсюль ад малых хутаркоў да самага Мінска. Кіраўніцтва рэспублікі перабольшвала небяспеку з боку палітычна нядобранадзейных груп жыхарства мястэчак. Галоўным праціўнікам тут, згодна афіцыйнай версіі, былі сіяністы, якія перашкаджалі адукацыі часткі яўрэйскай моладзі згодна савецкім шаблонам, агітавалі за выезд у Палесціну, стваралі альтэрнатыўныя камсамолу і піянерам маладзёжныя арганізацыі. Сіяністычны рух атрымаў найбольшую колькасць прыхільнікаў у тых мястэчках, якія найбольш пацярпелі ад пагромаў. Пачуццё нацыянальнай салідарнасці, якое актыўна развівалася і ў перадваенныя гады, бачанне Палесціны як даўняй радзімы, зразумела, як і разбурэнне гаспадаркі спрыялі выспяванню настрояў каб выехаць з Беларусі. Найбольш папулярнымі ў беларускіх мястэчках былі сіяністычныя арганізацыі Хе-Халуц (Гехалуц)[53] і Ха-Шо-

[51] Еженедельная информационная сводка Мозырского ОГПУ. Декабрь 16, 1924, ДАГАГВ, ф. 69, воп. 2, спр. 27, арк. 3.

[52] З. Бядуля, *З краязнаўчага блакноту пісьменніка: Лірыка мястэчка Койданава*, „Наш край", 1930, № 1 (52), с. 47.

[53] Гехалуц (піянер, іўрыт, Гехолуц, ХеХалуц) — яўрэйская сіяністычная арганізацыя, мэтай якой было падрыхтаваць яўрэйскую моладзь для пасялення ў Палесціне і працы ў земляробчых калоніях. У 1923 г. раскалолася на афіцыйную «Гехолуц в СССР» (левае крыло, зарэгістраванае ў Маскве) і нелегальную «Национально-трудовую организацию Гехолуц» (правае крыло, дзейнасць якога прызнавалася нелегальнай).

мер-ХеЦаір (Гашомер-Гацаір)[54], якія актыўна праводзілі сваю дзейнасць, ахопліваючы яўрэйскую моладзь. Бальшавікі не цярпелі нават тых левых плыняў, якія адкалоліся ад гэтых арганізацый, каб не мецьпраблем з савецкім заканадаўствам. Напрыклад, калі легальны Гехалуц вольна дзейнічаў у Маскве, то яго прадстаўніцтва не было зарэгістраванае ў БССР. НКВД адмовіла гэтай арганізацыі ў легальнай дзейнасці. Савецкі рэжым выкарыстоўваў разнастайныя метады барацьбы з палітычнымі апанентамі, якія нават існавалі легальна і дзейнічалі згодна савецкаму праву. Мясцовыя ўлады павінны былі сачыць за сіяніскімі групамі ў іх паселішчах і неадкладана данасіць аб іх дзейнасці ў райкамы партыі і ДПУ[55]. Актывістам пагражалі дыскрэдытацыя і арышты, суд за закрытымі дзвярыма і высылка на некалькі год у Сібір, Казахстан і Сярэднюю Азію. Тэрмін высылкі да трох гадоў за сіянізм не быў такім страшэнным пакараннем як рэпрэсіі часоў ваеннага камунізму і наступнага дзесяцігоддзя. Але праз турмы і высылку праходзіла значная частка актыўнай яўрэйскай сіяністычна арыентаванай моладзі, якая не выступала супраць савецкай улады, а магчыма нават і спагадала ёй. Падчас антысіяністычных кампаній пэўная частка яўрэйскай моладзі мястэчак праходзіла праз засценкі ДПУ. Пазбегчы арыштаў магчыма было толькі выехаўшы за межы БССР, але органы таксама адсочвалі карэспандэнцыю выехаўшых да бацькоў і сваякоў. Падазроныя лісты перадаваліся спецадзелам ДПУ для распрацоўкі[56].

Нэп ажывіў гаспадарку мястэчак, якая была цесна звязана з пасрэдніцкімі функцыямі, лакальным гандлем і дробнай вытворчасцю. Цэнтральная ўлада ўжывала класавы (дыферэнцыяваны) падыход да сваіх грамадзян у мястэчках, падзяляючы іх лаяльнасць да рэжыму згодна прыналежнасці да пэўнай сацыяльнай групы. Але ў гэты ліберальны перыяд толькі пэўныя групы жыхароў мястэчак падвяргаліся рэпрэсіям — былыя палітычныя праціўнікі, сябры сіяністычнага руху, святары. Выбары ў саветы дапускалі бачнасць пэўнай лібералізацыі, але спісы пазбаўленцаў вярталі людзей у савецкую рэчаіснасць. Камуністы неслі раскол і ў этнічныя супольнасці. Калі на вёсцы беднату і серадняка цкавалі на т.зв. кулакоў (заможных сялян), то ў мястэчку спецыфічнай мішенню сталі гандляры і нэпманы. Аднак т.зв. барацьба з на-

[54] Гашомер Гацаир (малады страж, іўрыт, Хашомер ХаЦаір) — сіяністычная арганізацыя, аб'ядноўваючая моладзь; мэта дзейнасці — адпраўка ідэалагічна і фізічна падрыхтаванай моладзі ў Палесціну.

[55] Циркулярное письмо местечковым ячейкам КП(б)Б. 7.8.1923, ДАГАГВ, ф. 623, воп. 1, спр. 1, арк. 74.

[56] Як праходзіла перлюстрацыя лістоў працаўнікамі ДПУ апісана ў артыкуле: V. Izmozik, *Soviet Jewry as Reflected in Letters Intercepted by the Leningrad OGPU, 1924-1925*, „Jews in Eastern Europe", 1994, no. 1 (23), pp. 32-46.

цыянальным адзінствам (раскол этнічных супольнасцей згодна класаваму падыходу) не давала пэўных поспехаў у гады нэпа і значна ўзмацнілася ў канцы 1920-х гг.

Адыход ад нэпа ў 1928 г. азначаў новы наступ савецкай дзяржавы на правы сваіх грамадзян. Руйнаванне прыватнага сектара балюча адбілася на гаспадарчым жыцці мястэчак. Мястэчка ў царскія часы ў пэўнай меры існавала аўтаномна, этнічныя супольнасці (яўрэі) мелі права на свае традыцыйныя адукацыйныя ўстановы. Савецкі рэжым насаджаў савецкую мадэль, згодня якой рэлігіі і традыцыі, як прыватным заняткам, адводзідася маргіналізаваная роля. Пераход да т.зв. камандна-адміністрацыйнай ці сталінскай мадэлі кіравання значна пагоршыў статункі ўлады і насельніцтва мястэчак. У час сталінскай рэвалюцыі зверху ўлада зачыняла вочы на правы чалавека, на правы этнічных меншасцей. Мясцовае кіраўніцтва прыкрывалася загадамі зверху аб суцэльнай калектывізацыі, раскулачванні мястэчак, высылцы падазроных з памежных паселішчаў і інш. Дзяржава ўжо дэманстрацыйна парушала правы вернікаў усіх канфесій мястэчак, актыўна насаджаючы атэізм. Саветы ў мястэчках працавалі пад строгім кантролем партыйных установ

Наступ дзяржавы на палітычныя, гаспадарчыя правы грамадзян выклікаў абурэнне і супраціў. Пасіўнымі формамі супраціву была самаізаляцыя пэўных супольнасцей, ігнараванне пастаноў партыі і ўрада. Часам нацыянальныя меншасці не „разумелі дзяржаўнай мовы" не таму, што не ведалі расійскай ці беларускай мовы, але не жадалі слухаць, што ім кажа прыезджы лектар або рэгіянальны партыйны ці савецкі дзеяч. Верагодна, адной з форм супраціву супраць савецкай рэчаіснасці быў выезд. Міграцыя, выезд са сваіх паселішчаў, мела месца ў мястэчках як з савецкага, так і польскага боку мяжы. Адсутнасць пэўных перспектыў, банкруцтва ці жаданне змяніць свой лёс спрыялі адтоку часткі жыхароў, якія шукалі лепшай долі ў іншых раёнах ці краінах. Адначасова мястэчкі пакідалі найбольш амбітныя і здольныя жыхары, імкнуўшыяся палепшыць свой сацыяльны статус, атрымаць вышэйшую адукацыю ці знайсці больш прэстыжны занятак у буйнейшых гарадах. Большасць насельніцтва была вымушана адаптавацца да новых палітычных умоў, калі ні пасада, ні ранейшыя заслугі перад рэвалюцыяй і партыяй не гарантвалі бяспекі.

Агульныя працэсы мадэрнізацыі, якія мелі месца і ў іншых краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, разбуралі гаспадарку мястэчак. Рамеснікі не маглі канкураваць з фабрычнай вытворчасцю і вымушаны былі міграваць ці шукаць новых форм заняткаў. З гандляроў свае камерцыйныя пазіцыі захоўвалі тыя, хто валодаў значным капіталам і мог супрацьстаяць. Наступныя 1930-я гады — час паскоранай мадернізацыі гаспадаркі Беларусі, як і ўсяго СССР, перыяд жорсткіх выпраба-

ванняў (голад, рэпрэсіі) — балюча адбіліся і на жыцці жыхароў мястэчак. У гаспадарчым плане мястэчкі ўжо не былі цэнтрамі гандлю і рамяства, якімі з'яўляліся яшчэ ў часы нэпа. Прыватны гандаль быў ліквідаваны ці ператварыўся ў спекуляцыю ў пачатку 1930-х гадоў. Большасць саматужнікаў была аб'яднана ў арцелі, якія кіраваліся партыйнымі камітэтамі, атрымлівалі зверху вытворчыя планы, а нават не маглі распараджацца сваёй прадукцыяй, цэнтралізавана здаючы яе дзяржаве. У сацыяльным плане тут дамінавалі сацыяльныя групы сацыялістычнага грамадства: рабочыя, служачыя і кааперавания рамеснікі.

Адміранню мястэчак паспрыяла і канчатковая ліквідацыя местачковых яўрэйскіх саветаў, якія спрыялі захаванню пэўнай адміністрацыйна-культурнай аўтаноміі яўрэйскай супольнасці. Знікненне мястэчак як спецыфічных паселішчаў было заканадаўча абгрунтавана. Згодна з пастановай урада БССР ад 27 верасня 1938 г. «О классификации населенных пунктов Белорусской ССР» гарадскімі пасёлкамі лічыліся паселішчы з колькасцю жыхароў не менш чым 2 тыс., большасць якіх складалі рабочыя, служачыя і іх сем'і. Пад улік бралася наяўнасць прамысловых і камунальна-бытавых прадпрыемстваў[57].

Нельга выключыць і тое, што сталінскае кіраўніцтва атаясамлівала мястэчка з занядбалым паселішчам, якое дасталося ў спадчыну з папярэдняй эпохі, з рознымі «сацыяльнымі хваробамі» (значнай колькасцю беднякоў, маргіналізаванага насельніцтва, антысанітарнымі ўмовамі і інш.). Таму мястэчку, як перажытку мінулых часоў, не заставалася месца ў сацыялістычным грамадстве. Трэба дадаць, што добраўпарадкаванне мястэчак (у большасці раённых цэнтраў), актыўна пачаўшаеся з канца 1920-ых гадоў, часткова змяніла выгляд гэтых паселішчаў. Камунальнае будаўніцтва не набыла такой моцы як у гарадах, але некаторыя паселішчы, асабліва цэнтры раёнаў маглі пахваліцца новымі будынкамі школ, культурна-выхаваўчых устаноў. Недзе брукаваліся вуліцы і забудоўваліся цэнтральныя плошчы — месцы былых кірмашоў і рынкаў (Старыя Дарогі, Брагін).

Сталінскаму кіраўніцтву трэба было прадэманстраваць дасягненні савецкай гаспадаркі, мадэрнізацыі эканомікі і грамадства, урбанізацыі. Пасля няўдалых для рэжыму вынікаў перапісу 1937 г. савецкі ўрад жадаў прадэманстраваць рост насельніцтва краіны, асабліва павелічэнне колькасці гарадскіх жыхароў, што разглядалася адным з крытэрыяў поспехаў у мадэрнізацыі савецкай эканомікі і грамадства.Таму супрацоўнікі статыстычных устаноў, каб павысіць колькасць урбанізаванага насельніцтва, вымушаны былі дэманстраваць стараннасць, нават штучна[58].

[57] *Белорусская ССР. Краткая энциклопедия*, т. 1, Минск 1979, с. 236.

[58] *В. Б. Жиромская, Демографическая история России в 1930-е гг. Взгляд в неизвестное*, Москва 2001, с. 63.

Стасункі паміж насельніцтвам мястэчак і ўладай на працягу разглежанага дзесяцігоддзя вельмі цяжка ахарактарызаваць як дрэнныя — добрыя ці складаныя — простыя. Назіраліся пэўныя асаблівасці паміж падыходам цэнтральнай і мясцовай улад да канкрэтных паселішчаў (райцэнтр ці малое мястэчка, памежнае ці ў глыбі рэспублікі), адносінамі рэжыму і мясцовых кіраўнікоў да пэўных груп насельніцтва (падтрымка дробных вытворцаў ці цкаванне буржуазіі). Адбітак накладвалі гаспадарчае, сацыяльнае становішча жыхароў, іх дабрабыт, наяўнасць прыезджых служачых і іх персанальныя здольнасці. Пасля ліхалецця ваеннага камунізму часы нэпа магчыма паўстаюць перад намі як занадта ліберальныя гады, калі насельніцтва і ўлада прытрымліваліся нейкіх агульных правілаў паводзін, калі была бачнасць пэўнага дыялога. Зразумела, што жыхары мястэчак не былі ізаляваны ад тых грамадска-палітычных зрухаў, якія адбываліся ў СССР. Так ці інакш мястэчкі павінны былі стаць савецкімі. Людзі розных узроставых, сацыяльных груп парознаму рэагавалі на савецкую рэчаіснасць. Пэўная частка насельніцтва верыла, што будуюць сацыялізм і з’яўляюцца сведкамі пабудовы новага свету. Для іх пабудова новага савецкага мястэчка была такой жа істотнай задачай, як для мясцовай улады. Другая частка трымалася пэўнага нейтралітэту да ўлады, і толькі нейкая група пазіцыяніравала сябе як апаненты, прычым можа і не адмаўляючы новы рэжым. Поліэтнічнасць мястэчак накладвала свой адбідак на стасункі паміж уладай і жыхарамі. Бальшавікі ўлічвалі нацыянальны фактар, калі трэба было ўзяць пад свой кантроль пэўныя тэрыторыі, паселішчы, сацыяльныя групы. Яўрэйскасць мястэчак дапамагла і адначасова перашкаджала бальшавікам у апанаванні (не столькі ў палітычным, колькі нават у культурным і ідэалагічным плане) мястэчка. З аднаго боку, яўрэйства мястэчак стала натуральным хаўруснікам бальшавікоў падчас ваеннага камунізму, пагромы прымусілі жыхароў шукаць дапамогі ў найбольш моцнай сілы, з іншага — пэўная частка яўрэяў (як і іншых супольнасцей) гэтых паселішчаў не імкнулася будаваць сацыялізм па мадэлі прапанаванай бальшавікамі. Заробкі ў прыватным сектары гаспадаркі, свабода веравызнання, альтэрнатыва адукацыі, а не толькі савецкая школа на ідыш ці на беларускай мове, шматпартыйнасць — мелі сваіх прыхільнікаў у мястэчках у часы нэпа. Як адказ бальшавікоў тым, хто не жадаў ці сумняваўся ў неабходнасці будаўніцтва сацыялізму ў асобна ўзятым мястэчку, ці не пасаваў да савецкага будаўніцтва па сацыяльным становішчы-паходжанню, прапанаваліся: пазбаўленне правоў усёй сям’і, высылка ці добраахвотнае перасяленне ў рамках калгаснага, Крымскага ці Біраблджанскага праектаў і г.д. Мястэчка пастулова страчвала яўрэйскія рысы, але астатнюю кропку паставіў Галакост. Пасля вайны мястэчкі ператварыліся ў звычайныя паселішчы з незвычайным гістарычным мінулым.

**Streszczenie**

Miasteczka na Białorusi Radzieckiej nigdy nie były przedmiotem zainteresowania historiografii, dlatego badania na ten temat znajdują się w fazie początkowej. Ich cechą charakterystyczną była różnorodność etniczna i religijna z wyraźną przewagą ludności żydowskiej. W wyniku postanowienia Rady Komisarzy Ludowych BSRR z lipca 1925 r. części miasteczek nadano status prawny wsi, co w konsekwencji ograniczało je do roli ośrodków gospodarki rolnej i powodowało proces zmian struktury społeczno-zawodowej upodobniający do środowisk wiejskich. W okresie burzliwych wydarzeń lat 1918-1921 miasteczka na Białorusi często przechodziły we władanie walczących stron — bolszewików, Niemców, Polaków, Ukraińców. Każda władza okupacyjna dokonywała rabunków i gwałtów na miejscowej ludności. Najbardziej ucierpieli Żydzi podejrzewani o sprzyjanie bolszewikom. Zaś władze sowieckie, walcząc ze „spekulantami, sabotażystami i wrogami klasowymi", eliminowały najbardziej aktywnych członków społeczności małomiasteczkowej. W okresie NEP-u miasteczka na Białorusi Radzieckiej przeżywały okres prosperity nie tylko w sferze gospodarczej, lecz także kulturalnej. Język społeczności żydowskiej — jidysz — stał się jednym z języków urzędowych. W większości miasteczek działały także żydowskie rady, będące swoistą reprezentacją tego środowiska. W miarę rozbudowy sowieckich organów władzy następowała systematyczna sowietyzacja wszystkich sfer życia publicznego miasteczek, a także sposobu myślenia ich mieszkańców.